# На тым тыдні...

✓**14 і 15 кастрычніка** з нагоды Дня маці Нацыянальная бібліятэка Беларусі прапанавала наведнікам падборку дакументальных фільмаў нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», прысвечаную памятнаму дню. Дэманстраваліся стужкі «Дачка Прыпяці», «Зямляк», «Мая мама чараўніца», «Кася», «Надзея» ды інш. Усе іх яднае вобраз маці – найлепшага сябра, дарадцы, светлай мары...

Тамсама з **12 па 30 кастрычніка** арганізаваная **выстаўка «Пяшчотная, мілая, добрая»**, прымеркаваная да Дня маці, дзе прадстаўлена з сотню новых выданняў для кожнай клапатлівай маці: выхаванне дзяцей, здаровы лад жыцця, правільнае харчаванне, захаванне сямейных традыцыяў і ўкладу, добраўпарадкаванне і стварэнне камфорту ў доме.

✓**17 кастрычніка** ў мінскай прасторы «Imaguru» (вул. Фабрыцыуса) прайшоў **круглы стол «Беларусь і глабальнае змяненне клімату»**. У яго рамках абмеркавалі меры ў галіне змянення клімату і датычныя да праблемы абавязальніцтвы нашай дзяржавы, уплыў актуальных паказчыкаў кліматычных зменаў на Беларусь. Удзел бралі Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Іаана Казана-Вішнявецкі, каардынатар ініцыятывы «Моладзь за ўстойлівае развіццё», удзельніца Моладзевага саміта ААН па клімаце Ірына Панядзельнік, начальнік аддзела вывучэння клімату Белгідрамета Наталля Клявец, загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі, навуковы каардынатар праекта ПРААН-ГЭФ «Ветландс» Аляксандр Казулін ды інш.

✓**18 кастрычніка** ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры прайшло **адкрыццё выстаўкі «Сімвалы Беларусі ў мадэлях»**. Тут прадстаўленыя касцюмы аўтарства Ніны Кавальчук з Масквы. Наведвальнікі мелі магчымасць ацаніць работы Н. Кавальчук ў дынаміцы: пад час адкрыцця адбылося дэфіле.

Выстаўка дэманструецца па 10 лістапада.

✓**З 10 па 18 кастрычніка** ў Беларусі з афіцыйным візітам былі рэйнджар Леслі Свада і медзведзянятка Смоўкі, прадстаўнікі арганізацыі «US Forest Service», якая 75 гадоў з'яўляецца галоўным ахоўнікам паўночнаамерыканскіх лясоў ад пажараў. Арганізавалі візіт Лясная служба ЗША, Амбасада ЗША ў Беларусі і БГА «Адпачынак у вёсцы». У рамках візіту былі наведаныя Бярэзінскі біясферны запаведнік і Налібоцкая пушча, сустрэчы з школьнікамі і студэнтамі, у Музеі прыроды ў Мінску прайшоў паказ экалагічнай праграмы.

17 кастрычніка ў Бярэзінскім запаведніку госці сустрэліся з вучнямі мясцовай школы, выступілі на Рэспубліканскім семінары работнікаў нацыянальных паркаў і іншых прыродаахоўных установаў.

18 кастрычніка адбылася прэс-канферэнцыя, дзе госці, Леслі Свада і Мічэл Робертс, падзяліліся свамі ўражаннямі ад пабачанага. Арганізатары ад «Адпачынку ў вёсцы» зазначылі, што калі мы хочам мець адказную нацыю, то неабходна пачынаць працаваць з дзецьмі з маленства. Таму ў планах – Праграма маладых рэйнджараў.

✓**19 кастрычніка** ў Любанскім раённым цэнтры культуры адбыўся **фэст аўтэнтычнай песні «Бабулі»**. У канцэрце фальклорных гуртоў Любаншчыны выступілі калектывы вёсак Ямінск, Пласток, Закальное, Рачэнь, Обчын, Дарасіно, Кузьмічы, Камуна, Палічын, Жораўка, Сарачы, Шыпілавічы, Сосны, Дварэц. Пад час свята адбылася прэзентацыя кнігі-CD «Бяседныя песні».

У рамках фэсту былі выстаўкі старых фотаздымкаў «Вяселлейка па-любанску», вясельнай атрыбутыкі і рэканструяваных вянкоў (майстар Раіса Валькова з в. Кузьмічы), дэманстраваліся фотапрацы Альфрэда Мікуса «Любаншчына традыцыйная».

Добрым дадаткам стала вечарына «Танцы пад гармонік».



*Фэст «Бабулі» адбываўся не толькі ў сценах цэнтра культуры*